ВІЦЕБСКАЯ ДУХО́ЎНАЯ СЕМІНА́РЫЯ — сярэдняя рэлігійная навучальная ўстанова на Беларусі ў 19 — пач. 20 ст. Засн. уніяцкім архіепіскапам І.*Лісоўскім* ў 2-й палавіне 1807 у архірэйскім маёнтку Струнь (каля г. Полацк) на падставе ўказа імператара Аляксандра І (снеж. 1806). Прызначалася для навучання дзяцей белага уніяцкага духавенства Беларусі і называлася «Беларуская Грэка-уніяцкая духоўная семінарыя». Напачатку ўтрымлівалася за кошт маёнткаў і часткі грашовай сумы, адабранай ў базыльян. У фундуш семінарыі ўваходзілі маёнткі: Новы Двор, або Судзілавічы, Дзвоня, Гутава, Мягель, Чарсвяты Лепельскага пав. і Астраўляны Полацкага пав. У вер. 1808 мітрапаліт Лісоўскі зацвердзіў агульныя правілы навуч.-выхаваўчага працэсу семінарыі і вызначыў штат на 50 вакансій для «самобеднейших священнических и церковничьих детей» епархіі. У ліст. 1808 семінарыя перамясцілася ў г. Полацк у будынак Сафійскага сабора. У 1812 разрабавана французамі. У пач. 1813 заняткі аднавіліся ў в. Судзілавічы. У 1821 семінарыя пераведзена ў Полацк, знаходзілася ў залежнасці ад Гал. семінарыі пры Віленскім ун-це. Пасля заканчэння пяцікласнага агульнаадукацыйнага курса семінарыі вучні для далейшай адукацыі наведвалі *Полацкую езуіцкую акадэмію*. У 1823/24 навуч. г. пераўтворана ва ўласна семінарыю (2 аддзяленні) і ніжэйшае пры ёй вучылішча (мела 3 класы). Семінарскі курс уключаў да 28 прадметаў. У пач. 1828/29 навуч. г. стала 3-класнай (навучанне ў кожным класе працягвалася 2 гады). У 1839 яна ўраўнавана ў навуч. курсах з семінарыямі Пецярбургскай і Кіеўскай навуч. акруг. Пасля ліквідацыі уніяцкай царквы (1839) семінарыя стала правасл., у 1840 перайменавана ў Полацкую духоўную семінарыю. У пач. 1840-х г. яе маёнткі адабраны і семінарыя пераведзена на казённае ўтрыманне. У 1856 пераведзена ў г. Віцебск, у снеж. 1871 перайменавана ў Віцебскую. У 1872 паводле статута 1867 яна стала 6-класнай. У семінарыі выхоўваліся архіепіскапы В.Лужынскі і А.*Зубко*, гісторык К.*Гаворскі*. Зачынена пасля 1917.

*С.М.Васіліч.*